# Шалёныя! Маладыя! Жжжжурналістыя!

## З уласнага досведу рэалізацыі доўгатэрміновага навучальнага праекта “Школа маладога журналіста”

**Лана Руднік**



**Лана Руднік** — менеджэрка адукацыйных праграм НГА “Цэнтр «Трэці сектар»” (Гродна), магістрантка ЕГУ.

*“Мы не можам быць большым,*
*чым мы ёсць...*
*але тое, што мы ёсць,*
*нашмат больш, чым мы думаем”*



**Адшумеў Фэст моладзевай журналістыкі “Твой стыль”, які ладзіла да 10-гадовага юбілею наша арганізацыя ў партнёрстве з ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”. У праграме было шмат цікавага і незвычайнага: прэзентацыі вэб-рэсурсаў, моладзевых выданняў, майстар-класы, конкурсы і ўзнагароды, выпускны ШМЖ-10, сустрэча выпускнікоў розных набораў, прэзентацыя “Каталога лепшых выпускнікоў і выкладчыкаў праекта”, канцэрты, шоу “Венецыянскія згадкі” і, канешне, шмат эмоцый.**

Кожны раз, калі “выпускаем” чарговы набор, становіцца адначасова і радасна, і сумна. Радасна, што мы змаглі дайсці да фіналу, змаглі шмат чаму навучыцца і шмат чаго перажыць разам. А сумна таму, што прыходзіцца развітвацца з добрай камандай і добрай сяброўскай атмасферай, якая склалася пад час навучання.

Дзесятыя ўгодкі праекта “Школа маладога журналіста” — добрая нагода паразважаць пра тое, што мы паспелі зрабіць за гэты час. Наўмысна не хачу канцэнтраваць сваю ўвагу на тыповых праблемах, з якімі сутыкаецца кожная з грамадскіх арганізацый у нашай краіне. Як кажуць, “радасці мала”, а так хочацца…парадавацца. На гэты раз — за сябе і сваю арганізацыю, якая здолела на працягу такога доўгага перыяду ўтрымаць марку.

10 год існавання. 200 выпускнікоў. Больш за 1000 публікацый. Каля 20 навучальных газетак, каля 15 сталых выкладчыкаў. Што могуць сказаць гэтыя лічбы? Статыстыка — рэч адносная. Усе лічбы варта вывучаць у параўнанні альбо ў суадносінах з іншымі. Але з чым параўноўваць? Такога кшталту праект адзін з нямногіх у Беларусі…

## Пра гісторыю праекта і тых, хто яго робіць

Праект “Школа маладога журналіста” рэалізуецца адным з найстарэйшых грамадскіх аб'яднанняў Беларусі “Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў «Трэці сектар»”, заснаваным гарадзенскімі грамадскімі актывістамі і журналістамі ў 1997 годзе.

Арганізацыя працуе на карысць развіцця грамадскай актыўнасці розных колаў насельніцтва шляхам рэалізацыі інфармацыйных і адукацыйна-асветніцкіх праграм.

Распачыналі мы гэты праект у сакавіку 1997 года ў партнёрстве з “Моладзевым прэс-клубам” і газетай “Пагоня”.

Пра людзей, якія працуюць у праекце, можна распавядаць дастаткова шмат — яны розныя па прафесіях (журналісты, філолагі, гісторыкі, псіхолагі, юрысты), па поглядах, стылі жыцця, але тое, што аб'ядноўвае ўсіх — гэта нестандартнасць мыслення, дэмакратычныя каштоўнасці і актыўная грамадзянская пазіцыя.

Тых, хто працуе ў “ШМЖ”, можна падзяліць на тры катэгорыі: трэнеры, эксперты і арганізатары.

→



Роля трэнера (гэта не абавязкова журналіст) палягае найперш на ўменні арганізаваць навучальны працэс: падрыхтаваць занятак, усталяваць атмасферу даверу ў групе, дапамагчы эксперту ў арганізацыі дыскусій і працы ў групах, падсумаванні вынікаў занятка.

Эксперты (у нашым выпадку гэта былі журналісты і галоўныя рэдактары некаторых гарадзенскіх СМІ) адказваюць найперш за змястоўную частку занятка (разуменне тэрміналогіі, асноўных правілаў і схем, каментар заданняў, якія навучэнцы выконваюць на занятку, карысныя парады і г.д.).

Ідэальны варыянт — праца эксперта і трэнера ў пары як на этапе падрыхтоўкі занятка, так і на этапах яго правядзення і ацэнкі.

Задачы арганізатара (куратара праекта) — забяспечыць усе неабходныя ўмовы для працы трэнераў і экспертаў, трымаць "руку на пульсе" жыцця групы, арганізаваць маніторынг публікацый, кантактаваць з рэдакцыямі і выконваць шэраг іншых абавязкаў па арганізацыі навучальнага працэсу.

## Больш, чым школа журналістыкі

Першапачатковай ідэяй праекта была падрыхтоўка штатных і пазаштатных карэспандэнтаў для сродкаў масавай інфармацыі і выданняў грамадскіх арганізацый і ініцыятыў. Аднак хутка мы зразумелі, што журналістыка — гэта не толькі прафесія. Журналістыка — гэта пазіцыя і выдатная школа грамадзянскай адукацыі, якая рыхтуе актыўных грамадзян. Грамадзян, здольных быць эфектыўнымі і карыснымі ў сваёй супольнасці — умець узаемадзейнічаць і камунікаваць, прымаць рашэнні, крытычна аналізаваць інфармацыю, вырашаць канфлікты і прагназаваць сітуацыю. Таму другой мэтай праекта з'яўляецца развіццё грамадскай актыўнасці моладзі, павышэнне яе ўдзелу ў жыцці грамадства.

> "ШМЖ для мяне значна больш, чым журналісцкі досвед. Тут я набыла сяброў, з якімі падтрымліваю дачыненні да гэтага часу, навучылася актыўнай жыццёвай пазіцыі. Гэта бясцэнны досвед, за які я ўдзячна лёсу".
>
> **(Л. Асаковіч — "ШМЖ-3")**

- ШМЖ — гэта праект, накіраваны на дарослых людзей, якія падзяляюць адказнасць за поспехі навучання.
- ШМЖ — гэта праект, які не можа быць рэалізаваны без партнёрства з рэдакцыямі СМІ, журналістамі і грамадскімі актывістамі.
- ШМЖ — гэта некамерцыйны праект, які не прадугледжвае аплаты за навучанне.
- ШМЖ — гэта праект, які стымулюе беларускасць. Большасць заняткаў, якія праводзяцца ў Школе — праводзяцца па-беларуску.

## Для тых, каму за 16…

Кожны год навучэнцамі "ШМЖ" становяцца 20–25 чалавек з Гародні ва ўзросце ад 16 да 25 гадоў. Такія ўзроставыя вымаганні, прынамсі, мы ставім, калі абвяшчаем чарговы набор удзельнікаў праграмы. Здараюцца, канешне, выключэнні, але звычайна аснову кожнага набору складаюць студэнты і школьнікі старэйшых (10-11) класаў.

Абвяшчэнне набору ў "Школу" мы звычайна робім у верасні праз абвесткі ў мясцовых сродках масавай інфармацыі, навучальных установах, у электроннай рассылцы нашай арганізацыі "Кроніка грамадзкага жыцця Гарадзеншчыны". Не трэба таксама адмаўляць такі важны канал распаўсюду інфармацыі, які ў народзе клічуць "АБС" ("адна баба сказала"), які зараз становіцца ўсё больш папулярным (!) у часы ідэалагічнага кантролю і складанасці доступу да большасці СМІ.

Набор звычайна доўжыцца тры-чатыры тыдні, на працягу якіх ахвотныя да ўдзелу ў праекце людзі павінны запоўніць анкеты і запісацца на суразмову.

Здаралася так, што на 25 месцаў прэтэндавала 100 чалавек і таму графік суразмоваў быў вельмі напружаным.

> "Школа адкрыла мне новы свет, дала шмат сяброў і настаўнікаў па жыцці і працягвае дарыць веды і цяпло падрастаючым маладым гарадзенцам".
>
> **(С. Кузняцоў — "ШМЖ-3")**

Для правядзення суразмовы звычайна запрашаюцца некалькі журналістаў — будучых выкладчыкаў "Школы", а таксама каардынатары навучальнай і арганізацыйнай частак праекта. Кожны з сябраў "камісіі" мае табліцу з крытэрамі, паводле якіх ацэньваецца кандыдат: наяўнасць публікацый у школьных газетках ці СМІ, матывацыя да ўдзелу ў праекце, арыентацыя ў грамадскім жыцці, веданне рынку СМІ і камунікатыўныя здольнасці.

Галоўнай мэтай суразмовы з'яўляецца дапамога ў раскрыцці патэнцыялу кожнага з кандыдатаў, выяўленне ў нефармальнай атмасферы яго здольнасцяў (зрабіць гэта беспамылкова толькі на аснове анкеты складана). Гэтую ж мэту пераследуюць і творчыя заданні, якія атрымліваюць у час суразмовы многія навучэнцы (тыя, хто маюць надрукаваныя матэрыялы, вызваляюцца часта ад гэтага задання).

Творчыя заданні звычайна двух відаў — працягнуць тэкст інфармацыйнага паведамлення альбо падрыхтаваць у пары з іншым навучэнцам кароткае інтэрв'ю. Сумарная ацэнка па выніках суразмовы і за творчае заданне — прахадны білет на ўдзел у праекце.

> “ШМЖ — гэта тое, што ў мяне выклікае прыемныя ўспаміны і настальгію. Праект дапамог мне замацавацца ў журналістыцы, дапамог зразумець, што гэта — МАЁ”.
>
> (**А. Гуштын — “ШМЖ-9”**)

Мы практыкуем стварэнне двух відаў спісаў — асноўны і рэзервовы. Часта здараецца так, што па розных прычынах чалавек не можа працягнуць навучанне, і тады мы падключаем “рэзервістаў”.

У час першых набораў мы арганізоўвалі тэставанне на прафесійную прыдатнасць і схільнасць да прафесіі (такую паслугу можна было атрымаць у гарадскім цэнтры прафарыентацыі), але затым упэўніліся, што вынікі такога тэставання далёка не заўсёды з'яўляюцца аб'ектыўнымі: “лепшыя” па выніках тэставання, здараецца, не здольныя напісаць хоць адзін артыкул, а з “горшых” часам выходзяць таленавітыя журналісты.

Сярод нашых выпускнікоў шмат вядомых у гарадзенскай і беларускай журналістыцы імёнаў — Павал Мажэйка, Інга Астраўцова, Алена Сіневіч, Юлія Дарашкевіч, Дзяніс Курчэўскі, Таццяна Залеўская, Вольга Венская, Алена Стасюкевіч, Зміцер Ягораў, Марыя Садоўская, Алесь Залеўскі, Вольга Буевіч, Алена Пронская, Сяргей Бяганскі, Валеры Руселік і інш.

## Крыху пра канцэпцыю

Навучальная праграма “Школы маладога журналіста” складаецца з наступных частак: уводзіны, асновы камунікацыі, асновы журналістыкі, прававыя і этычныя аспекты журналістыкі.

На ўводных занятках мы знаёмімся паміж сабой, размаўляем пра тое, што такое журналістыка, якую ролю сродкі масавай інфармацыі выконваюць у грамадстве, пра функцыі журналістаў.

Асобны блок заняткаў прысвечаны камунікацыі, а менавіта: майстэрству слухаць і чуць, у даступнай форме перадаваць інфармацыю і ўдакладняць сэнс атрыманай інфармацыі, разумець прычыны камунікацыйных бар'ераў і г.д.

На занятках па асновах журналістыкі мы знаёмімся з асноўнымі журналісцкімі жанрамі, вучымся складаць ліды і загалоўкі да сваіх тэкстаў. Ёсць тут і заняткі больш спецыялізаваныя, напрыклад, асвятленне грамадска-палітычнага жыцця, дзелавыя і эканамічныя навіны альбо культурнае жыццё, экажурналістыка і г.д.

Неад'емнымі элементамі гэтай часткі праграмы з'яўляюцца практыка ў мясцовых сродках масавай інфармацыі (звычайна на працягу двух месяцаў) і выданне вучэбных газет (звычайна мы ствараем дзве рэдакцыі, кожная з якіх за час удзелу ў праекце выдае па 2–3 нумары сваёй газеты).

Наступная частка заняткаў тычыцца прававых і этычных аспектаў працы журналіста. Гаворка ў часе гэтых заняткаў ідзе пра правы і абавязкі журналістаў, пра магчымыя прававыя пасткі, у якія могуць патрапіць неспрактыкаваныя журналісты.

Шмат увагі аддаецца таксама абмеркаванню журналісцкай этыкі (часам мы нават стваралі ўласны этычны кодэкс навучэнцаў “ШМЖ”). Гэты блок у праграме “ШМЖ” вельмі важны — з самага пачатку навучання нашы маладыя журналісты пачынаюць пісаць матэрыялы, супрацоўнічаць з рэдакцыямі СМІ, і наша задачай з'яўляецца засцераганне іх ад магчымых памылак і непрыемных сітуацый, звязаных з няведаннем асноў заканадаўства, якое рэгламентуе працу журналістаў, а таксама пэўных этычных нормаў.

## Вучымся па-іншаму

Навучанне ў "Школе маладога журналіста" моцна адрозніваецца ад традыцыйных формаў навучання ў школах і ВНУ. Навучальны працэс прадугледжвае выкарыстанне інтэрактыўных метадаў і прынцыпаў навучання дарослых. Мы зыходзім з таго, што маем справу з людзьмі, матываванымі да навучання, гатовымі да актыўнага засвойвання новых ведаў, авалодвання новымі ўменнямі. Мы пагаджаемся з тым, што да кожнага навучэнца павінен быць індывідуальны падыход, таму што кожны навучаецца ў сваім тэмпе. Навучанне засноўваецца на схеме “Ад простага (пазнавальнага) — да складанага” і прынцыпах мультысэнсарнасці, інтэракцыі і стымулявання зваротнай сувязі.

Пры распрацоўцы методыкаў правядзення кожнага занятка мы зыходзім з прынцыпа навучання праз досвед. Паводле Дэвіда Колба, кожнаму чалавеку ўласцівы свой стыль навучання. Хтосьці, да прыкладу, лепш вучыцца праз актыўнае эксперыментаванне, а хтосьці аддае перавагу спакойнаму чытанню кніг альбо назіранню за іншымі людзьмі. З гэтай прычыны на нашых занятках мы імкнемся ствараць магчымасці і для атрымання канкрэтнага досведу (напрыклад — правядзення інтэрв'ю), і для рэфлексійнага назірання (як гэтае інтэрв'ю выглядала збоку), і для абстрактнай канцэптуалізацыі (што было зроблена добра, што можна было б зрабіць лепш, як бы я паступіў у гэтай сітуацыі) і для актыўнага эксперыментавання з атрыманымі новымі ведамі. Навучэнцы павінны выйсці з занятка з новым досведам — і гэта з'яўляецца асновай тых метадаў, якія мы выкарыстоўваем у працы з маладымі журналістамі.

Інтэрактыўныя метады прадугледжваюць сумеснае навучанне (навучанне ў супрацоўніцтве): і ўдзельнікі, і трэнер з'яўляюцца актыўнымі суб'ектамі працэсу навучання. Мэтай заняткаў з'яўляецца не толькі атрыманне новых ведаў і уменняў, але і змяненне/паляпшэнне мадэляў паводзінаў. Атрымліваючы новы досвед, назіраючы за сваімі рэакцыямі і паводзінамі іншых удзельнікаў навучальнага працэсу, чалавек змяняе сваю мадэль паводзінаў і свядома яе засвойвае.

Інтэрактыўныя метады дазваляюць задзейнічаць не толькі свядомасць чалавека, але і яго пачуцці і эмоцыі, што, у сваю чаргу, дазваляе палепшыць якасць засваення матэрыялу. Мы ў розны спосаб стымулюем актыўнасць нашых навучэнцаў: арганізоўваем дыскусіі, прапаноўваем да абмеркавання жыццёвыя сітуацыі, багата часу аддаем на працу ў групах.

> “ШМЖ нечакана для мяне адкрыла дзверы ў цікавую, творчую сферу дзейнасці. Сустрэчы, разнастайныя мерапрыемствы, простыя людзі і vip-персоны, паездкі па Беларусі і за мяжу — мноства сюжэтных ліній і герояў. Гэта найцікавейшыя гады жыцця, пражытыя захапляльна і эмацыйна дзякуючы прафесіі журналіста”.
>
> (**Т. Залеская — “ШМЖ-2”**)

Інтэрактыўныя метады карысныя яшчэ і тым, што развіваюць камунікатыўныя здольнасці навучэнцаў. У адрозненне ад звыклай для большасці навучальных устаноў мадэлі аднабаковай камунікацыі, дзе роля выкладчыка палягае на наданні інфармацыі, а роля навучэнцаў — на яе пасіўным успрыняцці,

→

у “ШМЖ” усяляк культывуецца мадэль шматбаковай камунікацыі. Роля трэнера на нашых занятках палягае на арганізацыі дыскусіі, стымуляванні крытычнага мыслення, заахвочванні да выказвання сваёй пазіцыі. Усе ўдзельнікі навучальнага працэсу пры гэтым узаемадзейнічаюць адзін з адным, абменьваюцца інфармацыяй, сумесна вырашаюць праблемы, мадэлююць сітуацыі, ацэньваюць дзеянні калег і свае ўласныя паводзіны.

Звычайна праграма навучання ў “ШМЖ” разлічана на 6–7 месяцаў. Заняткі адбываюцца 2 разы на тыдзень увечары па 2 гадзіны. Быў досвед, калі мы планавалі заняткі ў іншы спосаб (напрыклад, навучанне ў першым наборы доўжылася 3 месяцы, а ў 2003–2004 гг. замест штотыднёвых заняткаў у нас былі два інтэнсіўныя пяцідзённыя трэнінгі і паміж імі практыка ў СМІ), але досвед паказаў, што пасля 7 месяцаў — нараджаюцца здаровыя дзеці. Ой, канешне ж, журналісты.

Кожны занятак патрабуе старанная падрыхтоўкі. Пачынаючы ад планавання мэтаў і задач, распрацоўкі зместу, выбару метадаў, рамкавых умоў і сканчаючы раздаткавымі матэрыяламі і іншымі рэсурсамі.

Першае, чаму павінны нашы ШМЖ-кі навучыцца — навучыцца чытаць, аналізаваць прачытанае і, вядома ж, пісаць. Абавязковай умовай удзелу ў праекце з'яўляецца падрыхтоўка навучэнцамі матэрыялаў для СМІ (за год мы маем каля ста надрукаваных матэрыялаў). Часам, аднак, маладыя журналісты маюць праблемы з пошукам тэмаў і тады на дапамогу прыходзіць “Гарачая патэльня”, якую мы практыкуем напрыканцы занятка. Гэта своеасаблівая бура прапаноў, у час якой і навучэнцы, і трэнеры, і эксперты агучваюць ідэі магчымых тэмаў матэрыялаў, называюць розныя падзеі і факты, якія могуць стаць добрай інфармацыйнай асновай для журналісцкіх матэрыялаў.

Навучанне ў “ШМЖ” не сканчаецца са сканчэннем занятка. Вельмі вялікая частка адводзіцца на індывідуальную працу — кансультацыі, рэкамендацыі па напісаных матэрыялах. Такога кшталту кансультацыі дазваляюць навучэнцам глыбей засвоіць тыя ці іншыя сакрэты журналісцкага майстэрства, адчуць сябе больш упэўнена на этапе, калі яны яшчэ не маюць сталых кантактаў з журналістамі і рэдактарамі, не ведаюць спецыфіку выданняў. Пытанняў і праблем, асабліва на першым этапе, вельмі шмат. І ад таго, наколькі камфортнай будзе атмасфера, цікавыя выкладчыкі і ўважлівыя куратары, залежыць поспех навучання.

Для атрымання пасведчання пра сканчэнне “ШМЖ” кожны навучэнец павінен мець не менш 5 публікацый, падрыхтаваных за час удзелу ў праекце. Як правіла, больш як $^{2}/_{3}$ удзельнікаў праекта штогод спраўляюцца з гэтай задачай.

Што дазваляе нам казаць — паспяховы ці не наш праект? Паказчыкі, на якія мы найперш арыентуемся пры ацэнцы вынікаў кожнага выпуску — колькасць публікацый, падрыхтаваных удзельнікамі, ступень іх актыўнасці ў межах праекта (удзел у падрыхтоўцы вучэбных газет, удзел у дзейнасці розных грамадскіх ініцыятыў і арганізацый), а таксама іх працаўладкаванне ў рэдакцыях СМІ, заангажаванне ў дзейнасць розных НГА. Кожны трэці наш выпускнік дагэтуль звязаны з журналісцкай альбо грамадскай дзейнасцю.

Добра, калі пад час рэалізацыі праекта акрамя метадалагічнага падмурку, добрай каманды (часта гатовай працаваць на валанцёрскіх пачатках) і іншых неабходных рэсурсаў з'явяцца “фішкі”, характэрныя толькі для вас. Вісілкамі кожнага набору ў нас прыдумляліся кожны раз новыя — святкаванні, віншаванні, вечарыны і іншыя сумесныя мерапрыемствы, якія дазваляюць адчуць увесь смак нефармальнага навучання.

Сканчаем, як правіла, урачыстай вечарынай з уручэннем пасведчанняў навучэнцам і падзякаў выкладчыкам.

Са спадзевам на будучае супрацоўніцтва. Наперадзе ШМЖ-11!

■

кароткая даведка

## “Школа маладога журналіста”

- Праграма грамадскага аб'яднання “Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў «Трэці сектар»”. Існуе з 1997 года. Прадугледжвае падрыхтоўку штатных і пазаштатных карэспандэнтаў для СМІ, а таксама выданняў НГА Гарадзеншчыны, павышэнне сацыяльнай актыўнасці моладзі.
- Праграма рэалізуецца ў выглядзе штогадовых 7-месячных праектаў пад агульнай назвай “Школа маладога журналіста”. Курсанты (моладзь ва ўзросце ад 16 да 25 гадоў) праходзяць курс “Асновы журналістыкі”, стажыруюцца ў рэдакцыях гарадзенскіх СМІ, выдаюць свае навучальныя газеты. З сакавіка 2007 г. у межах праекта створаны штотыднёвая інтэрнэт-газета і інтэрнэт-радыё “Твой стыль” (**www.t-styl.info**).
- У межах “Школы маладога журналіста” рэалізоўваліся два падпраекты: **“Маладзёвае інфармацыйнае агенцтва”** і **“Адрасы бяды”**. Падпраект “Маладзёвае інфармацыйнае агенцтва” дзейнічаў з 1998 года і меў на мэце падрыхтоўку курсантамі “Школы” журналісцкіх матэрыялаў пра жыццё горада і краіны. Штогод у гарадзенскіх і агульнабеларускіх СМІ з'яўляецца каля 100 публікацый, падрыхтаваных навучэнцамі “ШМЖ”.
- Падпраект “Адрасы бяды” быў рэалізаваны на працягу 1998–1999 гг. і меў на мэце прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем людзей у крызісных сітуацыях.
- Навучэнцы “Школы маладога журналіста-3” і “Школы маладога журналіста-4” наведвалі дзіцячыя дамы, шпіталі, спецыяльныя ўстановы, грамадскія арганізацыі, якія займаюцца дапамогай людзям у бядзе. Вынікам праекта сталі дзесяткі публікацый у гарадзенскім друку, прысвечаных людзям у бядзе.
- Праект “ШМЖ-8”, які рэалізоўваўся на працягу 2003–2004 гг. быў скіраваны на падрыхтоўку карэспандэнтаў для рэгіянальных СМІ і прэс-сакратароў НГА Гарадзеншчыны. Удзел у праекце брала моладзь з Гародні, Смаргоні, Ліды і Слоніма.
- З 1997 года ўдзел у праекце “Школа маладога журналіста” ўзяло каля 200 чалавек. Амаль кожны трэці выпускнік “Школы маладога журналіста” дагэтуль звязаны з дзейнасцю СМІ альбо НГА Беларусі і іншых краін.
- У траўні 2007 г. у гонар 10-годдзя “Школы” ў Гародні сумесна з ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” быў праведзены Фестываль моладзевай журналістыкі “Твой стыль”, удзел у якім бралі каля 100 чалавек.